МАЯ РАДЗІМА - БЕЛАРУСЬ

**Тэма: Багацце нашай краіны**

**Мэта:** *ўяўленне аб найбольш важных відах прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў і сельскагаспадарчай вытворчасці.*

**Задачы:**

**а) навучання:** паказаць вучням, як беларускі народ у пасляваенны час падымаў з руін гарады і вёскі, фабрыкі і заводы, аднаўляў сельскую гаспадарку; пазнаёміць вучняў з прадукцыяй, якую выпускаюць прамысловыя прадпрыемствы Беларусі, як сельская гаспадарка рэспублікі вырашае сваю галоўную задачу забеспячэння насельніцтва рознымі прадуктамі харчавання, а прамысловасць — сыравінай, як ажыццяўляецца перавозка грузаў і людзей сродкамі транспарту;

**б) развіцця:** развіваць у вучняў уменне выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял і праз ажыццяўленне краязнаўчай работы папаўняць свае гістарычныя веды;

**в) выхавання:** выхоўваць у вучняў пачуццё гонару за свой край, за яго працавітых людзей, якія шляхам вялікіх намаганняў аднавілі Беларусь пасля Вялікай Айчыннай вайны, зрабілі яе багатай і квітнеючай краінай.

1. **Арганізацыйны момант**
2. **Праверка дамашняга задання**

*Выкананне тэставых заданняў па тэме **«Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны»***

**1. Пазнач знакам «+» правільныя адказы на пытанні.**

• Вялікая Айчынная вайна пачалася:

⬜ 22 ліпеня 1941 г.

⬜ 22 чэрвеня 1941 г.

• Беларусь была вызвалена ад нямецкіх захопнікаў:

⬜ 9 мая 1945 г.

⬜ 3 ліпеня 1944 г.

**2. Дапоўні сказы.**

*Першы ўдар ворага прынялі пагранічнікі і воіны_________ (Сталінграда; Брэсцкай крэпасці). На тэрыторыі Беларусі, якая была захоплена ворагамі, разгарнулася сапраўдная ________ (народная; рэйкавая) вайна. Партызанскім разведчыкам і сувязным стаў амаль стогадовы _______ (Трыфан Лук’яновіч; дзедТалаш).*

**3. Адзнач знакам «+» праўдзівыя выказванні.**

⬜ *«Рэйкавую вайну» супраць фашыстаў вялі партызаны.*

⬜ *У Трасцянцы пад Мінскам знаходзіўся лагер смерці.*

⬜*Пад Мінскам, дзе адбылося акружэнне фашысцкіх войскаў, пасля вайны ўзняўся Курган Перамогі.*

⬜*Аб жудаснай трагедыі, якая напаткала вёску Хатынь, нагадваюць званы.*

**4. Адзнач знакам «+» прычыны, па якіх гэта вайна атрымала назву «Айчынная».**

⬜*На барацьбу з немцамі ўзняліся толькі дарослыя мужчыны.*

⬜*На барацьбу з немцамі ўзняўся ўвесь народ — ад малога да старога.*

⬜*Людзі змагаліся за свабоду сваёй Айчыны.*

⬜*Людзі змагаліся за сваіх кіраўнікоў.*

**5. Пазнай па апісанні і запішы імёны воінаў — герояў Вялікай Айчыннай вайны.**

*1) Герой Курскай бітвы, лётчык, збіў у баі 9 самалётаў.* ______________________.

*2) Юны партызан, гераічна загінуў у 14 гадоў* .________________________________.

*3) Салдат-беларус, які абараніў нямецкую дзяўчынку.* _________________________.

*4) Абаронца Брэсцкай крэпасці, камандзір.* ___________________________________.

*5) Партызанскі камандзір, Герой Савецкага Саюза.* __________________________.

**Выкарыстай імёны:** *Канстанцін Заслонаў, Аляксандр Гаравец, Марат Казей, Трыфан Лук’яновіч, Пётр Гаўрылаў.*

**3. Паведамленне тэмы і мэты ўроку**

_ Новы матэрыял не будзе звязаны з вайной, на сённяшнім уроку мы будзем вывучаць мірную працу грамадзян Беларусі ў пасляваенны час, а таксама знаёміцца з тымі вынікамі, якія былі дасягнуты працоўнымі нашай рэспублікі. Тэма нашага ўрока -“Багацце нашай краіны”.




**4. Тлумачэнне навага матэрыялу**

***<u>Аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі</u>***

Тлумачэнне матэрыялу першага абзаца ажыццяўляецца настаўнікам. Падчас работы з матэрыялам на працягу ўрока афармляецца шнфаграфіка “Багацце нашай краіны”.

– Вайной былі нанесены вялікія страты нашай краіне.Перамога над ворагам натхняла людзей. Мужнасцьна вайне ператварылася ў працоўны гераізм. Працавіты і цярплівы беларускі народ не паў духам. Дзякуючы самаадданай працы былі адноўлены гарадыівёскі, фабрыкі і заводы, транспарт і сельская гаспадарка. Рэспубліка паўстала з руін, але незагойнай ранаю на яе сэрцы засталіся больш двух мільёнаў сыноў і дачок, што загінулі ў полымі той страшнай вайны. Але мужны беларускі народ не скарыўся бядзе. Людзі пабудавалі новыя жылыя дамы, вырвсцілі багаты ўраджаі, наладзілі выраб прадуцыі на прамысловых прадпрыемствах.




Прамысловасць і гаспадарка ўзаемазвязаны паміх сабой.




Вывад: для аднаўлення страт, нанесеных фашыстамі, спатрэбілася пяць гадоў напружанай працы.

***<u>Прамысловасць Рэспублікі</u>***

Матэрыял змяшчаецца ў 2—6 абзацах.

Вывучэнне новага матэрыялу ажыццяуляецца шляхам чытання ўслых, каменціравання прачытанага і вылучэння ў ім галоўнага. Канчатковым вынікам работы вучняў будуць вынесены на слайд.




***Гаспадарка Беларусі***

*Работа з «Атласам Рэспублікі Беларусь»(с. 28)*

Практычнае заданне.

1. Пазнаёміцца з умоўнымі абазначэннямі.

2. Знайсці гарады, пералічаныя ў падручніку, у якіх знаходзяцца машынабудаўнічыя заводы. (Мінск, Жодзіна, Гомель.)

3. Знайсці на карце атласа месцы здабычы нафты і калійнай солі. (Рэчыца, Салігорск.)

4. У якіх гарадах ёсць прадпрыемствы па выпуску мінеральных угнаенняў? (Салігорск — калійная соль, Гомель — суперфасфат, Гродна— азотнае ўгнаенне.)

**3. Сельская гаспадарка.**

Матэрыял ахоплівае 7— 10 абзацы вучэбнага дапаможніка.

Работа над ім ажыццяўляецца па папярэдняй схеме.




Выкарыстоўваецца матэрыял «Атласа Рэспублікі Беларусь» на с. 30.

*Практычная работавучняў.*

Азнаямленне вучняў з умоўнымі абазначэннямі.

- У якой частцы Беларус інасельніцтва займаецца вырошчваннем ільну?
- Дзеў нас пераважна сеюць буракі?
- У якіх раёнах рэспублікі займаюцца бульбаводствам? Як інакш называюць у нас бульбу? Чаму?
- Чаму каля буйных гарадоўвяскоВаенасельтцтвапераважназаймаеццапрыгараднайгаспадаркай? Назавіце такіягарады.
- Дзе ў Беларусі найбольш паспяхова развіваецца свінагадоўля?
- Падумайце над вывучаным матэрыялам і паспрабуйце вызначыць галоўную задачу, якую вырашае сельская гаспадарка нашай рэспублікі. (Галоўная задача— забяспечыцьнасельніцтвакраіны разнастайныміпрадуктаміхарчавання.)
- Акрамя прадуктаў харчавання людзям патрэбны адзенне, абутак, розныя прадметы быту. Для іх вырабу прамысловасці неабходна сыравіна. Такую сыравіну пастаўляе сельская гаспадарка.

5. **Замацаванне вывучанага матэрыялу**

- Для чаго патрэбны транспартныя сродкі?
- Ці можа краіна існаваць без транспарту?
- Што б маглоздарыцца, калі б транспартперастаўдзейнічаць?

*Практычная работа.*

_ Выкарыстоўваецца матэрыял атласа на с. 34.

_ Чым багата тэрыторыя нашай краіны? (Шмат рэк.)

_ Знайдзіце на карце атласа рэкі, якія з'яўляюцца суднаходнымі. Назавіцеіх. Назавіце буйнейшыя гарады рэспублікі, у якіх ёсць рачныя порты.

_ Падумайце, ці мае наша краіна праз свае рэкі сувязь з марамі. (Мае. З Чорным і Балтыйскім марамі.)

_ У якіх гарадах Беларусі ёсць аэрапорты?

_ Якое значэнне гэта мае?

_ Паспрабуйце вызначыць, ці звязаны абласныя цэнтры нашай дзяржавы аутамабільнымі магістралямі рэспубліканскага значэння.

Вучні працуюць з малюнкамі вучэбнага дапаможнка на с. 117—120.

*Заданне 1.* Параўнайце самазвал БелАЗ са спартыўнай машынай «Баггі». Зрабіце вывады з гэтага параўнання.

Адкажыце на пытанні:

1. Якія грузы могуць перавозіць БелАЗы?

2. Чаму яны працуюцьу кар'ерах?

3. Дзе можна сустрэць такія машыны? (Далёка за межамі рэспублікі.)

*Заданне 2.* Трактар «Беларус».

Адкажыце на пытанні:

1. Чаму ён так называецца?

2. Чым ён адрозніваецца: а) ад самазвала; б) ад легкавога аўтамабіля; в) ад грузавога аўтамабіля?

3. Чаму ў яго такія магутныя колы?

*Заданне 3.* Касілкі.

Рашыце задачу. Трактарная касілка мае шырыню захопу поля шэсць метраў. Касец з кассою можа размахнуцца на адзін метр шырыні поля. Хуткасць руху касілкіў 10 разоў большая за рух касца. Касец можа працаваць не большза 8 гадзін. Касілка можа працаваць цэлыя суткі. Падлічыце: колькі касцоў можа замяніць адна касілка? (Адказ: $1 \cdot 6 \cdot 10 \cdot 3=180$ касцоў.)

**6. Падвядзенне вынікаў урока**

7. **Дамашняе заданне:**апавяданне «Багацце нашай краіны».